**УДК 82.09**

# АСАБЛІВАСЦІ СТАНАЎЛЕННЯ «ВАЕННАЙ» АПОВЕСЦІ ВАСІЛЯ БЫКАВА

***Т.Р. БАГАРАДАВА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***
***t.baharadava@psu.by***

*Тэма Вялікай Айчыннай вайны займае вядучае месца ў творчасці В. Быкава і рэалізуецца ў жанры так званай «ваеннай» аповесці. Гонар, сумленне, вернасць абавязку – менавіта дадзеныя праблемы трапляюць у поле зроку пісьменніка. Адной з вядучых тэм аўтара выступае тэма гераізму. Пісьменніка цікавяць не столькі яго знешнія праявы, колькі шляхі прыходу чалавека да самаахвяравання. Характэрнай асаблівасцю «ваеннай» аповесці з'яўляецца тое, што ў цэнтры ўвагі аказваецца чалавек у памежнай сітуацыі выбару. В. Быкаў сваімі творамі ўнёс у нацыянальную літаратуру агульначалавечую маральную праблематыку, надаўшы ёй глыбіню і вастрыню. Пісьменнік сцвярждаў гуманістычную думку пра тое, што шматлікія трагедыі ў гісторыі народа павінны скончыцца пабудовай дэмакратычнага грамадства.*

***Ключавыя словы:*** *«ваенная» аповесць, эстэтычны кантэкст, «акопная» праўда, «лейтэнанцкая проза», «рэмаркізм», «згубленае пакаленне», прыпавесцевая шматзначнасць.*

**Уводзіны.** Тэма Вялікай Айчыннай вайны, нягледзячы на даволі вялікую часавую адлегласць, без перабольшання з'яўлялася адной з вядучых у сусветнай літаратуры. Дадзеная акалічнасць паспрыяла шматпланаваму яе адлюстраванню і ў межах айчыннага мастацтва слова. Відавочна, беларуская літаратура на тэму Другой сусветнай вайны развівалася пад уздзеяннем шматлікіх уплываў. У гэты плане даследчык М. Пруткоў вылучае наступныя тыпы сувязей: «Простыя, элементарныя, відавочныя – гэта ўплывы, вучнёўства, пераймальніцтва, водгукі або перапевы ці пераклічкі матываў, тэм, сюжэтаў і вобразаў. І сувязі больш складаныя, генетычныя – апасродкаваныя, прыхаваныя, якія не заўсёды ўсведамляюцца самімі пісьменнікамі» [1, с. 4].

Д. Ліхачоў выразна выказаўся наконт літаратурнага працэсу пераймання: «Не толькі кожная літаратура, але і кожная культура «несамастойная». Сапраўдныя вартасці культуры развіваюцца толькі ў судакрананні з іншымі культурамі, вырастаюць на багатай культурнай глебе і ўлічваюць вопыт суседзяў» [2, с. 149]. Дадзенае выказванне актуальнае ў дачыненні да «ваеннай» літаратуры, якая пераймала вопыт суседзяў і ўзбагачалася новымі тэмамі, формамі і сродкамі адлюстравання рэчаіснасці.

**Асноўная частка.** Развіццё франтавой тэмы, пачынаючы з канца 1960 – пачатку 1970-х гадоў, у рускай і беларускай літаратурах ішло па двух асноўных напрамках: стварэнне шырокіх гістарычных палотнаў-панарам і адлюстраванне мікракосму вайны (раскрыццё інтымнай сферы роздуму і эмоцый салдата). Да першага напрамку адносяцца творы К. Сіманава «Жывыя і мёртвыя», І. Стаднюка «Вайна», А. Чакоўскага «Блакада», да другога – В. Астаф'ева «Пастух і пастушка», Ю. Бондарава «Бераг», У. Распуціна «Жыві і помні», А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі», С. Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча», В. Быкава «Сотнікаў».

Дасягненнямі першага напрамку сталі: пашырэнне гістарычнай прасторы і часу, шырокі спектр ўяўленняў пра месца і ролю чалавека на вайне. Другі напрамак характарызуецца цікавасцю да шарагавага ўдзельніка вайны, да так званай «акопнай» праўды, паўсядзённага гераізму.

Тэхніка прозы, эстэтычнае бачанне свету В. Быкава стваралася на аснове сінтэзу нацыянальна-эстэтычнага кантэксту, літаратурна-мастацкай спадчыны рускіх і замежных аўтараў. У дзяцінстве пісьменнік чытаў творы пісьменнікаў замежжа: Ж. Верна, В. Скота, М. Рыда, Д. Лондана. Па вызначэнні самога аўтара дадзеныя аўтары фармавалі яго як асобу і ў плане пісьменніцкага самавызначэння «паклікалі да іншага і светлага» [3, с. 3].

У творчасці класіка беларускай літаратуры М. Гарэцкага распрацоўваліся дзве «лініі» беларускага рэалізму: першая – разгляд індывідуальнай свядомасці і яе ўзаемадачыненняў з грамадствам, другая – адлюстраванне народнай свядомасці і яе гісторыі. Апошняя «лінія» адлюстроўвалася ў раманах К. Чорнага і асабліва поўна – у пазнейшых ваенных творах аўтара.

В. Быкаў даволі высока ў айчыннай літаратуры ставіў творчасць К. Чорнага. Па словах пісьменніка: «Значэнне творчасці К.Чорнага выходзіць далёка за межы адной толькі нацыянальнай культуры…Як і кожны сапраўдны мастак, ён не змяшчаецца ні ў рамках сваёй культуры, ні ў сферы свайго часу» [3, с. 154].

Кніга М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» прадвызначыла агульны шлях развіцця беларускай прозы пра вайну, у прыватнасці, жанру аповесці і аб'ектывавана-дакументальны накірунак яе развіцця. Гэты шлях пасля плённа быў выкарыстаны В. Быкавым пры распрацоўцы жанру «ваеннай»

аповесці. Такім чынам, апасродкавана, шляхам узбагачэння духоўнага і мастацкага вопыту сродкамі айчыннай і сусветнай літаратуры, ішло станаўленне творчай манеты аўтара.

Калі праводзіць паралелі з рускай літаратурай, то раман-эпапея Л. Талстога «Вайна і мір» стала «настольнай» кнігай В. Быкава на працягу ваенных дзеянняў. Аднак варта адзначыць, што ўплыў класічнай літаратуры не быў роўным у творчасці пісьменніка. Яго творы 1960-х гадоў маюць адзнакі творчай манеры менавіта Л. Талстога і накіраваныя на распрацоўку псіхалагічнага пачатку характараў герояў. У перыяд 1970-х гадоў «ваенная» аповесць В. Быкава (творы «Сотнікаў», «Абеліск», «Дажыць да світання») падобныя да светапогляднай канцэпцыі Ф. Дастаеўскага.

Вышэй адзначаныя сувязі В. Локун назвала «вертыкальнымі». Калі казаць пра так званыя «гарызантальныя» ўплывы, то варта прыгадаць мастацкі вопыт пісьменнікаў-сучаснікаў аўтара. Па словах самога В. Быкава: «Пісаў я і пры поўным узаемаразуменні з маімі рускімі равеснікамі, аўтарамі таленавітых кніг пра вайну, сярод якіх у прешую чаргу хочацца назваць Юрыя Бондарава і Рыгора Бакланава. Я многім таксама абавязаны Алесю Адамовічу, выдатнаму беларускаму празаіку і самаму ўдумліваму з маіх крытыкаў» [3, с. 81].

Сацыяльнае ў савецкай прозе прапускалася праз ідэю савецкай улады. Герой «ваеннай» прозы адчуваў уплыў такой катэгорыі, як патрыятызм. Дадзеная катэгорыя, як і ўсе астатнія, вымяралася адзнакамі савецкай сістэмы. Эстэтычнае поле твораў В. Быкава істотным чынам адрозніваецца ад літаратуры савецкага часу. Аўтар адлюстроўваў новую вайну і новага героя, які не быў ідэалагізаваным і трансфармаваным пад савецкую рэчаіснасць. В. Локун зазначае: «В. Быкаў увеў у нацыянальную літаратуру салдата-працаўніка…Да ўсяго герой В. Быкава вызначаўся глыбінёй характару» [4, с. 12].

«Ваенную» аповесць пісьменніка вылучае крытэрый маральнасці. Герой аўтара – гэта заўжды асоба з арсеналам вышэйшых чалавечых якасцей. Персанажы В. Быкава з'яўляюцца праекцыяй пэўнага погляду аўтара на жыццё і ролю чалавека ў грамадстве. Характар прыпавесці і маральнага імператыву маюць аповесці «Сотнікаў», «Дажыць да світання». Адлюстраваннем пэўных перакананняў аўтара ў дачыненні да маральных крытэрыяў з'яўляюцца аповесці «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Знак бяды» і інш. Такім чынам, аўтар пачаў ствараць «ваенную» аповесць, маючы за плячыма багаты эмпірычны вопыт.

У творчасці В. Быкава відавочны ўплыў літаратуры «згубленага пакалення». Першая сусветная вайна «нарадзіла» літаратуру, якая знаходзілася на мяжы класічнага рэалізму і філасофска-эстэтычных крытэрыяў авангарду.

Да вопыту «згубленага пакалення» беларуская літаратура звярнулася толькі ў 1950-я гады, бо да гэтага часу займалася прапагандай ідэй кастрычніцкай рэвалюцыі і яе наступстваў. У дадзены перыяд сталі папулярныя творы Э.М. Рэмарка і Э. Хэмінгуэя. Савецкая крытыка папракала В. Быкава за так званы «запознены рэмаркізм», знаходзячы ў яго творчасці ўплывы вядомага замежнага майстра слова. Дадзеныя ўплывы былі недапушчальныя для савецкай літаратуры, бо лічыліся буржуазнымі. «Існавалі два ўзроўні «рэмаркізму»: рэмаркізм у адлюстраванні аб'ектыўнага вобраза вайны і рэмаркізм у адлюстраваннні яе духоўнай прасторы. Першы ўзровень – гэта якраз тое, што паядноўвае літаратуру «згубленага пакалення» і літаратуру «лейтэнанскую» – антываенную і антысталінскую адначасова» [4, с. 17]. Другі, па словах Л. Корань, адрознівае іх, бо «ступень несвабоды быкаўскага чалавека ёсць якасна, непараўнальна (можна сказаць, эпахальна) іншая, чым у герояў заходнееўрапейскіх баталістаў» [5, с. 129–130].

«Акопная» праўда пісьменніка не падабалася афіцыйнай крытыцы. Не прымала афіцыйная літаратура элементаў «асобнай» сітуацыі, дэталяў. Напрыклад, у аповесці «Паклятая вышыня» крытыка знайшла сінтэтычныя мастацкія абагульненні, за што папракала пісьменніка.

Уласны пісьменніцкі вопыт таксама не лічыўся крытэрыем вымярэння аб'ектыўнасці. Заўвагі крытыкі характэрныя для свайго часу, бо суб'ектыўнае адлюстраванне вайны будзе прымальным для літаратуры значна пазней. М. Тычына выказвае наступную думку: «..Увагу пісьменнікаў адцягвалі шматлікія фактары: пафас гераізму, прасякнутасць гордасцю, патрыятызм, загорнуты ў інтэрнацыяналізм…Між тым вайна не бывае выражэннем толькі класавых ці імперскіх інтарэсаў, імкнення да ўлады, патаемных геапалітычных планаў» [6, с. 250].

Вытокі «рэмаркізму» і «акопнай» праўды «ваеннай» аповесці пісьменніка варта шукаць у творчасці Л. Талстога, бо апісанне поля бою, вобраза вайны паходзяць з дадзеных крыніц. А. Адамовіч пісаў пра талстоўскае вымярэнне ваенных падзей: «…Служыла для шматлікіх літаратур і пісьменнікаў выратавальнай мерай – для тых, хто адрываўся ад рэальнасці…» [7, с. 131].

У 1990-я гады на старонках СМІ пачалася дыскусія аб пераасэнсаванні паняцця «Вялікая Айчынная вайна 1941 – 1945». Ставілася пад сумненне паняцце «айчынная» вайна ў дачыненні да Беларусі. Адзначалася, што палітыка ўлад у адносінах да салдат была вельмі жорсткай. Дз. Бугаёў канстатуе: «В. Быкаў – пісьменнік з трагедыйным бачаннем жыцця» [8, с. 7]. Аўтар чужую бяду ўспрымаў як сваю

уласную, адчуваў дыскамфорт ад праяў жорсткасці і неўладкаванасці. Менавіта таму ў «ваеннай» аповесці аўтара вайна ўспрымаецца як арэна трагічных дзеянняў.

«В. Быкаў, як Ю. Бондараў і Р. Бакланаў, належыць да пакалення пісьменнікаў-франтавікоў, якія на ўласным вопыце ведалі, што такое фронт і перадавая» [9]. Да заканчэння вайны В. Быкаў ваяваў на Паўночна-Заходнім фронце. Пісьменнік назваў пакаленне маладых людзей, што былі народжаныя ў 1920-х гадах і загінулі на вайне ў 1941 – 1945 гадах, «забітым пакаленнем». Пра гэта сведчыць і статыстыка: толькі тры чалавекі са ста з пакалення аўтара засталіся жывыя пасля вайны. У кнізе ўспамінаў «Доўгая дарога дадому» (2003) аўтар піша: «У пяхоце не было ніякага ўліку…Добра, калі пісар паспее перапісаць прозвішчы, а то ідуць безыменнымі. І гінуць… Нават снарады начальства лічыла, бо за іх адказнасць мела. А за людзей адказваў адзін Гасподзь Бог» [10, с. 59].

Праблема гераізму на вайне – пытанне спрэчнае, якое да нашых дзён застаецца дыскусійным. Людзі верылі, што, праганяючы ворага са сваёй зямлі, яны спрыяюць надыходу лепшага жыцця. Сталінскі рэжым не апраўдаў гэтых спадзяванняў. Праблема абавязку перад салдатамі, што не вярнуліся з поля бою, стала галоўнай у літаратуры пра мінулую вайну. Разглядам дадзенай праблемы «ваенныя» аповесці В. Быкава падобныя да твораў Р. Олдзінгтана, які адчуваў сябе глыбока абавязаным перад тымі, хто не вярнуўся з вайны: «Гэты цяжкі крыж на сваім сумленні нясуць не толькі яны, удзельнікі і сведкі вайны, але і той, «хто ідзе за намі» [11, с. 56]. В. Быкава на вайне цікавяць, перша за ўсё, магчымасці чалавечага духу, унутраны свет простага салдата. «Пад гэтымі словамі В. Быкава можна ўпэўнена ставіць і подпіс Э. Хэмінгуэя, хоць магчымасці духу чалавека цікавілі яго ў іншай сістэме маральных каардынат» [4, с. 35].

Герой Э.М. Рэмарка даваеннае жыццё ўспрымае летуценна, як і большасць герояў В. Быкава. Нават у ваенны перыяд героі В. Быкава – Іван Цярэшка, настаўнік Мароз, Ляўчук, Зоська Нарэйка, Сотнікаў, лейтэнант Іваноўскі – імкнуцца захаваць гармонію з акаляючым светам і душэўную раўнавагу.

А. Адамовіч перасцерагаў пісьменнікаў ад залішняй рамантызацыі памяці вайны: «…Ненавідзячы вайну, пачынаеш нечакана празмерна любіць і песціць сваю памяць пра яе…І вось ужо ружовай хлуснёй патыхае ад твора…Гонар не павінен афарбоўваць суровы і гераічны вопыт у ружовыя, ідылічныя ноты і настальгічную хлусню» [12, с. 102-103]. «Лейтэнанцкая проза» канца 1950-х – 1960-х гадоў несла рэальную праўду пра вайну і была ў гэтым падобная да літаратуры «згубленага пакалення». «Адным малюнкам» падаецца вайна ў Э. Хэмінгуэя і ў «ваеннай» аповесці В. Быкава: «Альпійская балада», «Мёртвым не баліць», «Сотнікаў», «Дажыць да світання», «Воўчая зграя», «Пайсці і не вярнуцца» і інш. Стрыманасць у паказе ваенных акалічнасцей яднае творы абодвух аўтараў. Падобным з’яўляецца цікавасць пісьменнікаў да паказу псіхалогіі і раскрыцця характару героя ва ўмовах ваенных дзеянняў. Вынікам разумення вайны ў эстэтыцы літаратуры «згубленага пакалення» варта лічыць наступны тэзіс Э. Хэмінгуэя: «Вайна – гэта зло, але часам трэба змагацца. Толькі ўсё роўна вайна – зло, і ўсялякі, хто стане гэта адмаўляць, – ілжэц» [13, с. 57]. В. Быкаў ва ўсіх сваіх творах прытрымліваўся прынцыпу чалавечнасці, асабліва ў аповесцях «Трэцяя ракета», «Альпійска балада», «Мёртвым не баліць», «Праклятая вышыня», «Воўчая зграя», «Сотнікаў», «Абеліск». Яшчэ ў 1960-я гады аўтар разглядаў праблему чалавечага сумлення, якая была прыярытэтнай у пісьменнікаў «згубленага пакалення». У аўтара сумленне чалавека на вайне з’яўляецца адносна свабодным ад залежнасці грамадства. Паказальным падаецца эпізод з немцам у аповесці «Трэцяя ракета», які ў разгар бою звальваецца ў акоп. Галоўны герой твора, Лазняк, праз прызму вобраза маці перажывае спектр самых разнастайных пачуццяў да гэтага чалавека. У выніку В. Быкаў даводзіць гуманістычную думку пра тое, што Лазняк стаў «вінцікам» сістэмы, якая забівала ў людзях чалавечнасць.

Этыка В. Быкава трансфармуецца і на будучыню. Чалавек, паводле перакананняў аўтара, павінен стварыць сябе сам, раскрываючыся пры дапамозе ўчынкаў. Герой аўтара – асоба нязломленая, але трагічная. Як паказала далейшая творчасць пісьменніка, В. Быкаў з песімізмам глядзеў у будучыню. Такім чынам, лёс большасці герояў аўтара трагічны, «толькі мастацкі пафас В. Быкава пры гэтым застаўся ранейшым, нязменным ва ўсе часы, скіраваным да гуманізму» [4, с. 127]. Тэма асобы, якая пастаўлена ва ўмовы трагічнай адзіноты, адчувае разлад з акаляючым светам, з’яўлялася адной з вядучых у літаратуры XX стагоддзя. Пасля прыходу да ўлады фашысцкага рэжыму ў Германіі свет апынуўся перад пагрозай знішчэння. У літаратуры пачаў адлюстроўвацца вобраз чалавека, які перажываў распад асобы. Экзістэнцыялізм адлюстроўваў метамарфозы такой асобы. У цэнтры дадзенай філасофіі – чалавек, асуджаны на свабоду, які ў працэсе ўласнага жыцця адказвае на яго галоўнае пытанне. «Такім чынам, асоба выключаецца з гістарычнай плыні і патанае ў татальнай экзістэнцыі» [4, с. 139].

Аб пэўных праявах элементаў экзістэнцыялізму ў творчасці пісьменніка загаварыла постсавецкая крытыка ў асобе І. Афанасьева, П. Васючэнкі. Сам В. Быкаў лічыў філасофію экзістэнцыялізму не зусім прымальнай для нашага грамадства, аднак высока цаніў творы А. Камю і Ж.-П. Сартра, узяўшы з іх своеасаблівую прыпавесцевасць. З успамінаў В. Быкава: «Асабліва ўразіў Сартр сваімі філасофскімі экспромтамі пра экзістэнцыялізм. Разумна ён гаварыў, Сартр, а я думаў, што ўсё ж праўда на баку ягонага земляка Камю, які зганіў СССР за канцлагеры, а Сартр за тое парваў з ім адносіны» [10, с. 242].

Своеасаблівымі прыпавесцямі варта лічыць «ваенныя» аповесці пачатку 1970-х гадоў «Сотнікаў», «Абеліск» і «Дажыць да світання». Праўда, пісьменнік катэгарычна адмаўляў пачатак прыпавесці ў гэтых аповесцях, канстатуючы, што ў аснове твора павінен ляжаць жывы матэрыял. Па словах В. Локун: «Тым не менш, «Сотнікаў», «Абеліск», «Дажыць да світання» вызначаюцца выразнай канструктыўнай зададзенасцю, запраграмаванасцю на высокую ступень маральна-этычнага эксперыменту» [4, с. 148].

Так званыя «экзістэнцыяльныя» «ваенныя» аповесці пісьменніка адрозныя ад дадзенага філасофскага напрамку па ўнутраным і змястоўным напаўненні. В. Быкаў экзістэнцыяльны ў разглядзе трагедыі індывідуальнага чалавечага лёсу ва ўмовах ваенных дзеянняў, праблемы жыцця і смерці, свабоды і адказнасці за яе, сэнсу жыцця і прызначэння чалавека. Экзістэнцыяльны матыў тупіку і расчаравання выразна гучыць у аповесці «Дажыць да світання». Адыход ад канкрэтыкі абавязваў да праўды і жыццёвых рэаліяў, што няпроста было адлюстраваць у той час, беручы пад увагу ваенную тэматыку.

Аўтар ўспамінаў: «Аповесць «Сотнікаў» (у першым варыянце «Ліквідацыя») нарадзілася не так «з галавы», як з пачуццяў, што былі натхнёныя не вайной, а нашай сучаснасцю» [10, с. 310]. У «Сотнікаве» праблема свабоды выбару звужана да мінімуму. Жыццё з’яўляецца мерай усіх каштоўнасцей чалавека. Прычым, жыццё сапраўднае. Несапраўдным выступае існаванне ненатуральнае, звыродкавае, якое абраў Рыбак. Апазіцыя Сотнікаў – Рыбак падаецца класічнай па сваёй сутнасці: Авель і Каін, Хрыстос і Юда. З аднаго боку, асоба, якая робіць сябе сама, з другога – чалавек як асоба распадаецца, здраджвае сабе і, у выніку, знікае з твару гісторыі. «Змаганне Сотнікава трэба…разумець як змаганне вялікага духу, духу-абсалюту супраць бездухоўнасці. На фоне або як паралель духу звычайнаму – вобраз Рыбака. У той час як фізічныя магчымасці ўсё больш абмяжоўваюцца, герой застаецца свабодным і незалежным ў сваім унутраным выбары» [4, с. 180].

Сотнікаў бачыць свой працяг, сваё далейшае жыццё ў хлопчыку ў будзёнаўцы. Іваноўскі ахвяруе сваім жыццём у імя будучыні, спадзеючыся на змену жыцця да лепшага. В. Быкаў у аповесці «Абеліск» пісаў пра настаўніка з Мядзельшчыны – Міколу Пашковіча, які быў энтузіястам сваёй справы і захапляўся беларускай літаратурай. Настаўнік Мароз з прыгаданага твора вартасцю жыцця лічыць яго працяг, ахвяруючы сабой дзеля выхаванца. Пісьменнік канстатуе: «Мяне цікавілі… подзвігі духу» [10, с. 338].

Відавочна, В. Быкаў тварыў на мяжы рэальнага і экзістэнцыяльнага. Апошняе з’яўляецца толькі адным эстэтычным момантам рэалістычна-псіхалагічнай і рэалістычна-аналітычнай прозы пісьменніка і гэта «паспрыяла яму ў выпрацоўцы сваёй адметнай мадыфікацыі жанру аповесці, чыста «быкаўскай», у якой традыцыі рэалістычнай эстэтыкі складана сінтэзаваліся з інтэлектуалізмам, разумовым пачаткам, мастацкім канструяваннем рэчаіснасці і асобы, канструяваннем іх узаемасувязей і ўзаемадачыненняў» [4, с. 220–221].

Галоўнай крыніцай вывучэння мастацкага мыслення пісьменніка, якая дае магчымасць раскрыць гісторыю станаўлення аўтарскай задумы і законы творчасці, з’яўляюцца самі творы і адметнасці літаратурнага працэсу, звязаныя ў тым ліку з сацыяльнымі фактарамі. Паказчыкам станаўлення творчасці варта лічыць і акалічнасці стварэння аповесцей В. Быкава.

М. Тычына канстатуе: «Даследчык творчасці Быкава…знаходзіцца ў даволі складаных умовах. Рукапісная спадчына пісьменніка невялікая» [8, с. 9]. Аўтар не любіў захоўваць вялікую колькасць чарнавікоў, бо адзінкай сапраўдай вартасці мастацкага твора ён лічыў само жыццё. Менавіта праўда факта з’яўлялася крытэрыем вымярэння для пісьменніцкай творчасці. Аднак, гэтая праўда стала непрымальнай для метаду сацрэалізму. Факт з асабістага жыцця, калі нямецкі танк ледзь не раздавіў В. Быкава, быў апісаны пісьменнікам у аповесці «Мёртвым не баліць». Дзеянні нкусаўцаў і смершаўцаў апісваліся пісьменнікам з тонкасцю і праўдзівасцю. В. Быкаў успамінае: «Колькі нашага брата-пісьменніка пагарэла менавіта на праўдзе. А на хлусні наадварот рабілі кар’еру» [10, с. 70]. У выніку «Мёртвым не баліць» разграмілі. У газеце «Правда» крытык У. Сеўрук канстатаваў няўдачу В. Быкава, абараняў гонар Савецкай Арміі, даваў устаноўкі наконт таго, як пісаць на тэму мінулай вайны. «Красная звезда» ў артыкуле Баранца і Лашкова выкінула свой галоўны абвінаваўчы козыр – намер аўтара сутыкнуць два спрадвеку братнія народы, беларускі і ўкраінскі…Можа, даўжэй за іншыя трымаў паўзу «ЛіМ». Правінцыйныя газеты, якія не маглі аператыўна арганізаваць уласныя артыкулы супраць «ідэалагічнай дыверсіі» Быкава, перадрукоўвалі іх з цэнтральных…«Мёртвым не баліць» былі аб’яўлены творчай няўдачай аўтара» [10, с. 247–248]. Такім чынам, спатрэбілася больш за дваццаць гадоў, каб ўсё стала на свае месцы і аповесць назвалі адным з лепшых твораў пісьменніка. Дадзеную аповесць пасля надрукавалі ў Берліне на нямецкай мове.

Пісьменнікам ва ўмовах савецкага ладу вельмі часта даводзілася прыстасоўвацца пад абставіны. Нават сябры станавіліся ворагамі ў імкненні зрабіць кар’еру за кошт іншага. Вядомы факт, калі на з’ездзе пісьменнікаў А. Савіцкі выступіў з крытыкай творчасці В. Быкава. Аўтар напісаў яму запіску: «Далёка пойдзеш, Алесь». «Як у ваду глядзеў. Галоўная ісціна веку: сябра з’еў – сам таўсцейшым стаў» [10, с. 256].

Падобны лёс напаткаў і аповесць «Праклятая вышыня», бо пасля выхаду ў часопісе «Маладосць» твор разграміў нейкі крытык Агееў. Савецкая ідэалогія дыктавала аўтарам, як і пра што пісаць. Праўда, аповесць «Круглянскі мост» была добра сустрэта і на Беларусі, і ў Расіі. Сябра В. Быкава –

А. Твардоўскі – даводзіў думку пра тое, што трэба браць прыклад з заходняй літаратуры экзістэнцыялізму, у прыватнасці, з Камю: «Ягоны раман «Чума» – гэта ж Евангелле ХХ стагоддзя» [10, с. 281].

Цікавы лёс аповесці «Пайсці і не вярнуцца», якая вырасла з апавядання на спрадвечную тэму кахання. Менавіта ў гэты перыяд асабістае жыццё пісьменніка змянілася: ён ажаніўся з Ірынай Суворавай, якая стала другой жонкай аўтара. Матыў бездапаможнасці і разгубленасці перад лёсам праходзіць праз дадзены твор.

Аповесць «Знак бяды» пісалася паслядоўна. У гэты твор быў устаўлены сюжэтны кавалак, які аўтар параўноўваў з ядром у арэху. Вялікі адрэзак нацыянальнай гісторыі ўбірае ў сябе гэты твор: калектывізацыя і акупацыя як галоўныя наступствы чалавечай бяды. Усе ранейшыя аповесці, да «Знаку бяды» ўключна, мелі праблемы з друкаваннем. Многія часткі аповесцей скасоўваліся: пісьменніка прымушалі перапрацоўваць сцэны, спрэчныя з пункту гледжання ідэалогіі. У «Знаку бяды» таксама «вытруцілі надта канфліктную сцэну раскулачвання, яшчэ нешта. Цэнзары, канешне, выдатна адчувалі, дзе быў «знак бяды», і дужа імкнуліся, каб таго не сцяміў чытач» [10, с. 430].

**Заключэнне.** В. Быкаў – пісьменнік, які кожным сваім творам абуджаў у свядомасці людзей думку пра неабходнасць радыкальных змен. Паняцце выбару, адоленне абсурднасці жыцця з'яўляюцца неад'емным сцвярджэннем творчай спадчыны пісьменніка. «Яму як мастаку слова ўласцівая высокая ступень мастацкай праўдзівасці, глыбіня пранікнення ў таямніцы народнай і чалавечай псіхалогіі, рэдкая рэчыўнасць вобразнага бачання свету, фенаменальная своечасовасць водгуку на падзеі, прыпавесцевая шматзначнасць, дакладнасць прароцтваў» [14, с. 414–415].

Амаль ўсё жыццё В. Быкаў пісаў пра вайну. Гэтая неабходнасць – распавядаць людзям праўду – выяўляла духоўны патэнцыял, здольнасць быць свабодным ці рабіць іншы выбар. Па словах Я. Гарадніцкага: «Многія героі Васіля Быкава выбіраюць…шлях ігнаравання лабірынтаў» [8, с. 82]. Такім чынам, «ваенная» аповесць пісьменніка даводзіць думку пра свабоду асобы над абставінамі, імкненне зберагчы чалавечую годнасць у крызіснай жыццёвай сітуацыі.

ЛІТАРАТУРА


1. Прутков, Н.И. Историко-сравнительный анализ произведений художественной литературы / Н.И. Прутков. – Л., 1974. – 304 с.
2. Лихачёв, Д. Чем «несамостоятельна» любая культура, тем она самостоятельнее / Д. Лихачёв // Вопросы литературы. – 1986. – № 12. – С. 149.
3. Быкаў, В. Праўдай адзінай / В. Быкаў. – Мінск, 1984. – 234 с.
4. Локун, В.І. Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры / В.І. Локун. – Мінск : Тэхнапрынт, 2005. – 228 с.
5. Корань, Л. Цукровы пеўнік / Л. Корань. – Мінск, 1997. – 189 с.
6. Тычина, М. Чужие игры / М. Тычина // Нёман. – 1995. – № 10–11. – С. 250.
7. Адамович, А Толстовские традиции в литературе о войне / А. Адамович. – М., 1982. – 456 с.
8. Да 80-годдзя народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава : зб. навук. артыкулаў / БДУ, кафедра беларускай літаратуры ХХ стагоддзя ; рэдкал.: Л.Дз. Сінькова [і інш.]. – Мінск, 2005. – 275.
9. Человек на войне [Электронный ресурс] // Украинская библиотека. – Режим доступа: http://www.ukrlib.com.ua /sochinrus/ printout. php?bookid=22&id=59. – Дата доступа: 15.06.2016.
10. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому / В. Быкаў. – Мінск : ГАБТ Кніга, 2003.– 544 с.
11. Быкаў, В. На крыжах: Выступленні, артыкулы, інтэрв'ю / В. Быкаў. – Мінск : Беларусь, 1992. – 452 с.
12. Адамович, А. А если практически… / А. Адамович // Вопросы литературы. – 1976. – № 5. – С. 102–103.
13. Злобин, Г.П. По ту сторону мечты. Страницы американской литературы ХХ века / Г.П. Злобин. – М., 1985. – 566 с.
14. Баршчэўскі, Л. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына ; пад рэд. Л. Баршчэўскага. – Мінск : Радыёла-плюс, 2006. – 596 с.


*Паступіў 15.06.2016*

## THE PECULIARITIES OF THE FORMATION OF VASIL BYKOV'S «WAR» STORY

***T. BAGARADAVA***

*The theme of Great Patriotic War occupies a leading place in V. Bykov's creative work and is implemented in the genre of the so called «war» story.*

*Honour, conscience, faithfulness to one's duty are the problems that come into the author's view. One of the main author's themes is the theme of heroism. The writer is not so much interested in its external manifestations, as in the ways people come to the idea of self-sacrifice. The distinctive peculiarity of the «war» story is the fact that a man, who happens to be in the centre of attention, finds himself in an extreme situation, where he has to make his choice. With the help of his works V. Bykov has introduced common to all mankind moral problems into the national literature, enhancing their depth and acuteness. The writer supports the humanistic idea that the formation of the democratic society will bring an end to the numerous tragedies in the people's history.*

***Keywords:*** *«war» story, aesthetic context, «trench» truth, «lieutenant's prose», «remarkism», «lost generation», parable polysemy.*